является субъективной точкой зрения А.И. Куприна, который, думается, не был в деталях знаком со всеми подробностями военной и политической ситуации и не был осведомлен о «темных» сторонах этого ставшего историческим деятеля. Перед нами скорее сакральный метафоричный образ, чем документальная характеристика А.В. Колчака.

Самым поздним из анализируемых образов исторических личностей был создан портрет П.Н. Врангеля. В статье «Генерал П.Н. Врангель» (опубликована в газете «Общее дело», Париж, 1920, №81, 31 июля) писатель создает образ популярного у солдат генерала. П.Н. Врангель – смелый, талантливый, находчивый и образованный военачальник: «Широта его политических и стратегических взглядов, бесспорно, доказывает тем, что во время победоносного и беспрепятственного наступления армии Деникина на север, он один настаивал на том, чтобы вместо увлечения скорыми, дешевыми, бесплодными и потому гибельными лаврами была немедленно подана деятельная помощь войскам Колчака, отступившим от Пензы» [1, с. 326]. А.И Куприн приводит выдержки из письма П.Н. Врангеля А.И. Деникину, в котором он анализирует военную ситуацию и объясняет причины своего отступления в Константинополь. В письме П.Н. Врангель утверждает: «Но я знаю моих орлов и поэтому знаю и твердо уверен, что великое русское дело освобождения родины далеко не потеряно… Если судьбе не угодно будет предназначить меня для спасения России, то найдется другой, третий, десятый человек, а Россия все-таки будет спасена, будет сильна и здорова…» [1, с. 327]. Писатель убежден, что П.Н Врангеля нельзя осуждать за его отступление, называет его великодушным и скромным военачальником. А.И. Куприн не идеализирует образ генерала П.Н. Врангеля и опирается на определенную документальную базу, что делает данный очерк адекватным образцом публицистики, в котором автор последовательно выражает свое мнение.

Идейным продолжением статьи «Генерал П.Н. Врангель» является публикация «О Врангеле» (опубликована в газете «Новая русская жизнь», Гельсингфорс, 1921, №103, 10 мая). В ней А.И. Куприн размышляет о прекращении существовании армии генерала П.Н. Врангеля в связи с отказом французского правительства финансировать ее. В армии П.Н. Врангеля писатель видел спасение для России. Статья заканчивается восклицаниями автора по поводу ее ликвидации: «Не дай Бог, чтобы наступил тот момент, когда Третья Россия, захлебываясь среди пожарищ собственной кровью, закричит: «Как вы смели способствовать гибели врангелевской армии! Проклятье вам!» [1, с. 369]. В статье «О Врангеле», которая стала идейными и стилистическим продолжением предыдущей статьи, «Генерал П.Н. Врангель», можно увидеть трагедию А.И. Куприна, который теряет надежду на победу Белого движения в Гражданской войне и освобождении России от большевизма.

**Заключение.** На примере рассмотренных статей можно заключить, что А.И. Куприн постепенно отходит от идеализации образов офицеров Белой армии, отдавая предпочтение политической аналитике и документальной оценке действий представителей Белого движения. Также можно наблюдать эволюцию взглядов писателя, который переходит от слепой веры в победу Белой армии в Гражданской войне к сомнениям о ее успехе в борьбе с большевиками.

1. Куприн А.И. Собрание сочинений: в 9т. / А.И. Куприн. – М.: Правда, 1964. – Т. 9 : Очерки: Воспоминания. Статьи и фельетоны. – 591 с.
2. Ефименко Л.Н. Публицистика А.И. Куприна /Проблемы жанрового своеобразия: диссертация на соискание ученой степени кандидата филологических наук. – Краснодар, 2003.

## ЛІРЫЧНАСЦЬ АПАВЯДАННЯЎ ЯДВІГІНА Ш.

***Прышчэпава А.Ю.,***
*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Русілка В.І., канд. філал. навук, дацэнт*

Ядвігін Ш. лічыцца адным з галоўных пачынальнікаў беларускай мастацкай прозы, які вучыўся ў самых выдатных майстроў слова, а менавіта ў Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча, быў знаёмы з Якубам Коласам, Максімам Багдановічам і Янкам Купалам, якія істотна паўплывалі на творчае станаўленне пісьменніка. Трэба адзначыць, што яго жыццёвы шлях быў складаным, гэта адбівалася на творчай біяграфіі аўтара.



Репозиторий ВГУ

Проза пісьменніка шматгранная, вылучаеца стылёвай разнастайнасцю, мае незвычайныя вобразна-мастацкія сродкі. Прачытаўшы яго творы, можна заўважыць глыбокую рэалістычнасць, лірыка-філасофскую імпрэсію, яскравае апісанне стану герояў.

На жаль, творчасць Антона Лявіцкага (псеўданім Ядвігін Ш.) не набывае асаблівай зацікаўленасці ў чытачоў. Гэта здараецца з-за таго, што чытач не "паглыбляецца" ў тэкст, знаёміцца з творам павярхоўна. Многія лічаць, што ўся творчасць пісьменніка звязана з фальклорам. Апавяданні аўтара ў большасці ўспрымаюцца як звычайная літаратурная апрацоўка легендаў, казак, паданняў і народых гутарак.

Для Ядвігіна Ш., як для выдатнага пісьменніка, у тэксце важным з'яўляецца не прадмет, а яго сэнс. Глыбокая думка – гэта сіла таленту аўтара. Менавіта гэта трэба зразумець і ўлічваць пры прачытанні яго твораў.

Актуальнасць нашага даследвання заключаецца ў тым, што пры значнай колькасці даследаванняў па творчасці Ядвігіна Ш. мала хто звяртае ўвагу на эстэтычную спецыфіку і асблівасці стылю аўтара. Грунтоўнай працы пра мастацкую своеасаблівасць "малой прозы" Ядвігіна Ш. няма, таму мы і звярнуліся да гэтай тэмы.

Мэта – выявіць ідэйна-мастацкія асаблівасці і лірызм "малой прозы" Ядвігіна Ш.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання выступаюць выбраныя творы Ядвігіна Ш. пачатку XX ст., у якіх больш яскрава прасочваецца творчы стыль аўтара. Метады даследавання – апісальны і аналітычны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Каб стаць упоравень з эпохай, многія беларускія пісьменнікі пачатку XX ст.сканцэнтроўвалі сваю ўвагу і свае сілы на форму ўзаемаадносін з фальклорам, які існуе на выключна традыцыйным літаратурным спосабе тыпізацыі рэчаіснасці. Многія мастакі таго часу пачыналі з некаторай апрацоўкі фальклорнага матэрыялу, пераказвалі тэксты ўжо існуючых твораў, бралі за аснову вобразы герояў, тэмы. Гэта рабілася дзеля таго, каб было ад чаго "адштурхнуцца" для пошуку сваёй тэмы і свайго стылю. Аўтары адштурхоўваліся ад гэтага вопыту і пераходзілі да выключна літаратурнага спосабу адлюстравання рэчаіснасці, у пераважнай большасці выпадкаў – рэалістычнага.

Так, напрыклад, у апавяданні Ядвігіна Ш. "Зарабляюць" (1909) яскрава паказана праблема дарэвалюцыйнага часу, які раскрываецца праз лёсы дзяцей-сіротак Адама і Ганулькі. Сюжэт разгортваецца ў форме маналогу хлопчыка Адама. Гэта форма надае апавяданню асобую інтанацыю. і яно выглядае нібы споведзь. Дзяцей выхоўвала толькі маці, жыццё іх паказваецца праз вочы дзетак, якія яшчэ наіўныя і вераць у дабро. Хлопчык расказвае не толькі пра сабе, але і пра сваю старэйшую сястру, пра маці. Адам з дзіцячым болем паведамляе пра маці, пра тое, як яна памірала і пра тое, як яе хавалі на могілках. "Так – крышку збоку – за плотам, бо казалі, што яна неяк не зусім так, як трэба для могілак, памірала" [3, с.36]. Відавочна, што маці скончыла жыццё самагубствам.

Хлопчык расказвае, як яго сястрычка любіла маляваць кветкі вугольчыкам на сцяне. Дзяўчынцы было шкада, што гэтыя кветкі чорныя, а не каляровыя. "Чорныя кветкі" – гэта, на нашу думку, мастацкая дэталь, якая паглыбляе драматызм твора.

Дзецям не было чаго есці, і яны былі вымушаны зарабляць самі сабе на жыццё. Драматычная развязка наступае менавіта тады, калі маленькі хлопчык разумее, як зарабляе сястра, з таго дня, як пайшлі яны на службу ў заможны рэстаран, калі мелі вопратку і ежу. Адам стаў лёкаем, а "Ганульку адзелі, як кралю якую, але работы не назначылі ніякай" і такіх, як Ганулька, "ёсць апроч яе тры" і "усе яны нічога не робяць: ходзяць ад стала да стала, госці іх адны перад другімі просяць да сябе, кормяць, пояць ды яшчэ гасцінцы даюць" [3, с.38].

Лірызм аўтара ў гэтым апавяданні выяўляецца не ў знешніх прыкметах, а праз псіхалогію і псіхалагічныя дэталі, якія ў спецыфічнай аўтарскай форме перадавалі змест з вуснаў хлопчыка і набывалі эмацыйную афарбоўку.

Значнае месца ў творчасці пісьменніка займаюць такія апавяданні, як "Васількі" (1911) і "Раны" (1912), дзе сапраўды выявіўся лірычны талент празаіка.

Апавяданне "Васількі" даследчыкі называюць вершам ў прозе, а "Раны" можна аднесці да своеасаблівага верлібра. Аналізуючы гэтыя творы, трэба заўважыць яскрава перададзены ўнутраны свет чалавека, праблемы духоўнасці (месца мастацтва ў жыцці, адносіны яго да рэчаіснасці, васількі як сімвал красы, жыта як рэчаіснасці) – гэта было новым і для Ядвігіна Ш., і для маладой беларускай прозы.



Рэпазіторый ВГУ

**Заключэнне.** У працэсе выпрацоўкі мастацкага стылю Ядвігін Ш. зрабіў шмат для фарміравання жанравай разнастайнасці беларускай літаратуры. Своеасаблівыя апавяданні-байкі з'явіліся ў беларускай прозе. Таксама аўтар яскрава стварае трапныя камічныя сюжэтныя сітуацыі, паказвае ўменне адлюстравання ўнутранай сутнасці з'явы.

Наяўнасць псіхалагічных твораў у аўтара сведчыць аб глыбіні майстэрства пісьменніка, аб набыцці адметных рыс творчай індывідуальнасці. Ядвігін Ш. пранік ў псіхалогію чалавека, раскрыў яго духоўны свет. Творчы шлях пісьменніка ішоў ад блізкіх да фальклорных лірыка-філасофскіх імпрэсій да рэалістычна-псіхалагічных апавяданняў. Гэта было сапраўдным выяўленнем агульных тэндэнцый развіцця маладой малой беларускай прозы, якая адразу імкнулася пераадольваць розныя спрошчаныя фальклорныя формы адлюстравання рэчаіснасці, старалася ўзбагаціць фальклорную паэтыку арыентацыяй на кніжную традыцыю, на здабыткі сусветнай культуры. Лірызм твораў пісьменніка быў адным з галоўных сродкаў выпрацоўкі індывідуальнага мастацкага стылю.


1. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : У 4-х т. Т. 1 : 1901-1920 / НАН Беларусі, Аддз-не гуманіт. навук і мастацтваў; Ін-т літаратуры імя Я. Купалы; Рэд. кал.: У. В. Гніламедаў [і інш.] . - 3-е выд. - Мінск: Белар. навука, 2003. - 583 с.
2. Чыгрын, І. Станаўленне беларускай прозы і фальклор / І. Чыгрын. - Мінск: Навука і тэхніка, 1976. - 451с.
3. Ядвігін, Ш. Выбраныя творы / Ядвігін Ш. - Мінск: Маст. літ., 1976. - 389 с.


## ПІСЬМЕННІК І СУЧАСНАСЦЬ У АПОВЕСЦІ Ф. СІЎКО “ПЛЕБЕЙСКІЯ ГУЛЬНІ”


***Радзіхоўская І.Г.,***

*студэнтка 4 курса ВДУ імя П.М. Машэрава, г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

*Навуковы кіраўнік – Русілка В.І., канд. філал. навук, дацэнт*


Сучасная беларуская літаратура імкліва і плённа развіваецца не толькі ў галіне традыцыйных жанраў: накірункі палёту пісьменніцкай думкі ахопліваюць цяпер самыя разнастайныя тэмы, увасабляючы іх у розных, часта выключна эксперыментальных, формах. Гэта дае падставу даследаваць навамодныя тэндэнцыі, у тым ліку параўноўваючы іх з ужо сталымі, класічнымі з'явамі літаратурных плыняў. Г. Кісліцына ў сваёй кнізе «Культурны градыент: ідэі, маніфесты, кірункі беларускай літаратуры на мяжы XX–XXI стагоддзяў» звяртаецца да творчасці Франца Сіўко, ацэньваючы яе ў металітаратурным кантэксце: даследчыца падкрэслівае страту літаратурацэнтрычнасці культуры. Такія даследаванні цікавяць не толькі навукоўцаў, але і саміх пісьменнікаў, якія ў сваіх творах імкнуцца засяродзіць увагу на тым, што адбываецца з літаратурай на сучасным этапе.

Адлюстраванне літаратурнай рэчаіснасці з пункту гледжання непасрэдных аўтараў-удзельнікаў літаратурнага працэсу актуальнае для вывучэння не толькі для гісторыі, але і для тэорыі літаратуры, а таксама для псіхалогіі творчасці, сацыялогіі, культуралогіі.

Мэта даследавання – выявіць асаблівасці і мастацкую значнасць разважанняў Ф. Сіўко пра ролю літаратуры і духоўны воблік сучасніка.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання ў артыкуле стала аповесць Ф. Сіўко “Плебейскія гульні”. У навуковым аналізе выкарыстаны дэскрыптыўны і супастаўляльны метады.

**Вынікі і іх абмркаванне.** “Плебейскія гульні” – спроба мастацкага асэнсавання, а часам і звычайная, прамая ілюстрацыя падзей, якія калісьці або адбываліся непасрэдна з аўтарам, або ён быў іх сведкам. Такі роскід у падыходзе да сюжэтаў не замінае ўспрыманню зборніка як цэласнага твора.

У аповесці літаратура згадваецца хутчэй кантэкстуальна. Аўтар вядзе размову пра людзей, звяртае ўвагу на іх паводзіны і ўчынкі, спрабуе растлумачыць псіхалогію.

Ф. Сіўко не разважае пра літаратуру як яна ёсць. Згадваючы людзей, так ці інакш звязаных з літаратурным светам, пісьменнік робіць асноўны ўпор на тое, у якія “гульні” яны “гуляюць” – выкрывае крывадушнасць, падман.

Часцей за ўсё, калі размова ў творы ідзе пра творчасць чалавека, Сіўко робіць гэта для таго, каб паказаць нейкі адмоўны бок гэтай справы, зноў жа такі, згодна з заяўленай тэматыкай



Рэпазіторый ВДУ